# Площадь памяти (http://www.budni.by/?p=17100)

*Воскресенье, 3.07.2016 08:00. Рубрика: Великая Победа, Новости. Просмотров: 192*

**Іншы раз назвы асобных вуліц, плошчаў — не менш каштоўны помнік гісторыі, чым бронзавыя ці бетонныя статуі, архітэктурныя збудаванні. Не сакрэт, што вучоныя-лінгвісты насцярожана адносяцца да назваў у гонар кагосьці. Але, здаецца, дарэмна: імянныя вуліцы дапамагаюць не аддаваць забыццю гісторыю. Імянная плошча ў цэнтры Шарашова, напрыклад, як раз з ліку іх: вось ужо амаль паўстагоддзя яна носіць назву Фіміна. Але, на жаль, не ўсім сучасным шарашоўцам вядома, хто гэты чалавек.**




Асоба Аляксея Фіміна звязана з ваенным перыядам гісторыі пасёлка.

Настаўніца мясцовай школы Тэрэса Панамар расказвае:

— Актыўнымі збіральнікамі звестак пра падзеі на Шарашоўшчыне, якія адбываліся падчас нямецкай акупацыі, сталі былы дырэктар мясцовага дзетдома і яго жонка. У 1960-х гэтая інфармацыя дапамагла перанесці астанкі байцоў з адзіночных пахаванняў у брацкую магілу. Былі знойдзены і

астанкі лётчыкаў, якія загінулі ў першыя дні вайны: асобы большасці з іх вызначылі па нумарах рухавікоў самалётаў. Такім чынам узнавілі і падрабязнасці расстрэлу ў 1942 годзе мірных жыхароў пасёлка.

У 1944-м годзе пры вызваленні Шарашова ішлі жорсткія баі. Дзякуючы гістарычным экспедыцыям, апытанню відавочцаў удалося даведацца больш-менш дакладнае месца гібелі капітана Фіміна — начальніка сувязі гвардзейскага мінамётнага палка: яно непадалёку ад з’езда з Пружанскай трасы на Шарашова. Ёсць і схема месца яго пахавання. Сціплую біяграфію гэтага чалавека пазней расказалі яго родныя.

Аляксей Кузьміч Фімін — ураджэнец сяла Стрыгіна Мурамскага раёна Уладзімірскай вобласці. У 1933 годзе ён закончыў Горкаўскі вучэбны камбінат сувязі. У 1938 годзе паступіў у Маскоўскую ваенную інжынерна-тэхнічную акадэмію сувязі імя Падбельскага. Да таго моманту А.К.Фімін паспеў абзавесціся сям’ёй. Першая дачка Валянціна нарадзілася ў 1934 годзе, праз год на свет з’явілася Зоя, затым — Альбіна, самая малодшая Ларыса 1941 года нараджэння.

Мернасць жыцця маладой сям’і з ваеннага гарнізона ў Люберцах закончылася з аб’яўленнем страшнай навіны аб пачатку вайны. Закончыць акадэмію Фімін не паспеў: з чацвёртага курса пайшоў на фронт. Аляксею Кузьмічу тады быў 31 год.

Баі пад Масквой, Паўднёвы фронт, Сталінградская бітва, Беларуская аперацыя. Аляксей Фімін прайшоў праз горан самых страшэнных падзей Вялікай Айчыннай вайны. Калі за плячыма засталося, здавалася б, самае складанае, капітан А.К.Фімін загінуў, упісаўшы сваё імя ў гісторыю вызвалення Шарашова.

Інфармацыі пра байца Чырвонай Арміі А.К.Фіміна пакуль няма ў электронным банку дакументаў «Подзвіг народа». Так атрымалася, што падрабязнасці яго франтавога шляху засталіся невядомымі і яго маладым нашчадкам. Сёлета на беларускай зямлі, там, дзе праліў кроў Аляксей Фімін, пабывалі яго дачка, унукі і праўнукі.

— Бабуля Ганна Іванаўна не любіла расказваць пра асабістае, таму тэма іх адносінаў з дзедам Алёшам была для ўсіх табу, — успамінае ўнучка Фіміна Кацярына. — Напэўна, многае магла б расказаць папера. Усе лісты, якія атрымлівала з фронту, яна беражліва захоўвала, але хавала ад староннiх вачэй. А перад смерцю папрасіла, каб як толькі яе не стане, усе салдацкія «трохкутнікі» спалілі. Мы выканалі яе волю і не сталі без дазволу чытаць гэтыя лісты.

Так агонь забраў з сабою і тыя таямніцы, якія захоўвалі франтавыя лісты, ітыя, што былі ў лістах, якія адпраўляла на фронт мужу Ганна Іванаўна. Дачка Альбіна Аляксееўна ўпэўнена, што ў кожным з іх былі дзіцячыя далонькі: жанчына заўсёды дасылала тату абмалёўкі рук кожнай з яго чатырох дачок. Усю карэспандэнцыю ўдаве вярнулі разам з пахаванкай: паведамленне сям’і адправілі адразу ж пасля гібелі А.К.Фіміна.



– У вайну мы жылі на Мурамшчыне ў бабулі: калі тата пайшоў на фронт, мама з дзецьмі вымушана была эвакуіравацца з Масквы, — расказвае Альбіна Аляксееўна. — У нашым сяле ў кожны дом папрыходзілі пахаванкі. Я была дзіцём — не ўсё ведала, але сёе-тое ўжо разумела. Лічыла нагодай для зайздрасці, што мой тата жывы, калі ў астатніх памёрлыя і ніколі не вернуцца дамоў.

Нават сёння сівавалосая жанчына не можа без слёз згадваць, як па-дзіцячы наіўную радасць абарваў прыход ліста і асабістых рэчаў Фіміна.

— Мы атрымалі бінокль, які сёння захоўваецца ў яго старэйшага ўнука Аляксея, названага ў гонар дзеда (да слова, сімвалічна, што ён нарадзіўся 9 мая), металічную банку і невялічкую пластыкавую каробачку зялёнага колеру, магчыма, ад узнагароды, але, каб у ёй была ўзнагарода, я не памятаю.

Увогуле, што тычыцца ўзнагарод, родныя капітана Фіміна так і не ведаюць, ці быў ён іх удастоены: нідзе пра гэта не знайшлі нават сціслай інфармацыі.

Удаве Фіміна цяжка прыйшлося ў пасляваенны час: жыллё ў Маскве забралі, паколькі квадратныя метры прадастаўлялі толькі сем'ям дзеючых ваеннаслужачых. Ганна Іванаўна змагла атрымаць пакой толькі ў камуналцы: хадзіла на прыём да Міхаіла Калініна, прасіла дапамагчы Васіля Сталіна, які жыў у гарнізоне. І як бы цяжка ні было адной падымаць дзяцей, больш не выйшла замуж.

Усё, што ёсць сёння ў Фіміных, — памяць. Безумоўна, іх вельмі радуе, што гэтую памяць стараюцца захаваць і ў Шарашове. У 1966 годзе дырэктар дзетдома Рыгор Іванавіч Дземідовіч давёў да канца сваю ініцыятыву знайсці сваякоў Фіміна: жонка загінуўшага і яго трое дачок прыязджалі ў пасёлак.

— Нам арганізавалі паездку ў Беларусь, — расказвае адна з дачок. — У пасёлку ўдалося знайсці жанчыну, у доме якой ён дажываў свае апошнія дні. Яна намрасказала, што капітан Фімін падарваўся

на міне, траўмы атрымаў несумяшчальныя з жыццём, таму везці яго ў шпіталь палічылі бессэнсоўным. Пры ім пакінулі салдата. Жанчына расказвала, як ён, чакаўшы прыходу смерці, супакойваў таго юнага байца, штосьці пісаў на паперы, затым камячыў яе і рваў, ізноў пісаў... Праз тры дні ён памёр.

А праз два гады пасля візіту сям'і была падтрымана ідэя надаць удзельніку вызвалення Шарашова ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў статус ганаровага грамадзяніна гарадскога пасёлка. Шмат вады ўцякло з таго часу, таму назваць год, калі было вырашана галоўную плошчу ў цэнтры пасёлка перайменаваць у плошчу Фіміна, сёння ніхто не бярэцца. Мяркуецца, гэта быў той жа 1968 год.

Маладое пакаленне Фіміных сёлета ізноў знайшло магчымасць прыехаць у Шарашова, ускласці кветкі да помніка ў цэнтры пасёлка — на плошчы, якая носіць імя іх продка. Хтосьці скажа: «Дзівакі! Ці варта ехаць за тысячу кіламетраў на некалькі гадзін?» Фіміны з таго ліку, каму памяць даражэй. Больш таго, нашчадкаў Вялікай Перамогі радуе, што 9 мая — гэта свята, якое аб'ядноўвае брацкія народы і нагадвае пра агульную гісторыю, якую мы з цягам часу абавязаны не забываць.













На здымках: лейтэнант Фімін; Аляксей і Ганна перад вайной; нашчадкі А.К.Фіміна каля брацкай магілы ў Шарашове; захавалася схема пахавання, зробленая ў гады вайны.

Марына Вакульская

Фота Сяргея Талашкевіча і з сямейнага архіву Фіміных.